# КУЛЬТУРОЛОГИЯ И ИСКУССТВОВЕДЕНИЕ

## КУЛЬТУРОЛОГИЯ

**УДК 94(476)**

# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ПОЛАЧЧЫНЫ Ў КРЫНІЦАХ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XIX СТАГОДДЗЯ (НОВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ І ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ РАКУРСЫ)

*канд. гіст. навук, дац. І.Р. ВУГЛІК*
*(Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава, Мінск)*

*На падставе прац А.М. Луніна, В.М. Севяргіна і іншых разглядаецца матэрыяльная культура Полаччыны канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя, прыводзяцца дадзеныя па дэмаграфіі, статыстыцы насельніцтва г. Полацка і Полацкага павета. Даследуюцца вытворчыя заняткі, промыслы і рамёствы, жыллё, сельскагаспадарчая тэхніка жыхароў Полаччыны. Адзначаюцца характэрныя рысы матэрыяльнай культуры жыхароў Полацка – драўлянае жыллё, пераважна гандлёвыя заняткі, а таксама змены ў архітэктуры горада, звязаныя з будаўніцтвам новых грамадскіх устаноў. Выдзяляюцца спецыфічныя для дадзенага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёну ў больш позні гістарычны перыяд кампаненты жылля, селькагаспадарчай тэхнікі, промыслаў сельскага насельніцтва: адносна малыя селькія пасяленні, блізкі да замкнёнага тып сядзібы, наяўнасць сярод тыпаў гаспадарчых будынкаў сушылкі для зерня, развітае льнаводства і інш.*

**Уводзіны.** Культура Полаччыны – аднаго з найбольш багатых і старажытных у культурных адносінах рэгіёну Беларусі – з’яўляецца істотнай крыніцай для рэканструкцыі гісторыі і культуры нашай краіны. Яна мае багатую гістарыяграфію, якая ахоплівае значны гістарычны час, у тым ліку і перыяд канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя. Гэты складаны час, дамінантай якога былі раздзелы Рэчы Паспалітай, мае спецыфічны гістарыяграфічны аспект – далучэнне краю да Расіі абумовіла з’яўленне гісторыка-статыстычных прац, прысвечаных у тым ліку і Полаччыне. Таксама гэта быў перыяд пачатку кардынальнай перабудовы палітычнай, эканамічнай, увогуле культурнай сістэмы беларускіх земляў, што абумоўлівае значнасць яго вывучэння. Гэты перыяд даследаваўся ў працах шэрага навукоўцаў, вынікі абагульнёны ў спецыяльных даследаваннях [1, с. 502 – 505; 2, с. 225 – 258; 3, с. 14, 31]. Разам з тым значнасць дадзенага часу для гісторыі нашага краю, а таксама тое, што асноўны апрацаваны матырыял адносна мала закранае матэрыяльную культуру (жыллё, адзенне, промыслы і рамёствы, сельскагаспадарчую тэхніку, інш.) Полаччыны, робіць яе вывучэнне актуальным і з’яўляецца мэтай дадзенай працы.

**Асноўная частка.** У даследуемы перыяд Полацк і акаляючая яго тэрыторыя пасля першага раздзела Рэчы Паспалітай (правабярэжныя землі) увайшлі спачатку ў Пскоўскую губерню, затым з 24 жніўня 1776 года ў Полацкую губерню, якая 12 мая 1778 года атрымала найменне «Полацкае намесніцтва». З 1796 года намесніцтва разам з Магілёўскай губерняй утварылі Беларускую губерню, з 1802 года Полаччына ўвайшла ў Віцебскую губерню. Беларускія землі, якія ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі пасля першага паздзелу Рэчы Паспалітай, гістарычна складалі гісторыка-культурны, этнаграфічны рэгіён Белай Русі. У абагульняючым «Аглядзе Расійскай імперыі...» 1787 года С. Пляшчэеў адзначаў, што Полацкае і Магілёўскае намесніцтвы складаюць «Бела-Русію» [4, с. 72], колькасць насельніцтва Полацкага намесніцтва – да 620 600 чалавек [4, с. 74].

У вопісах значная ўвага ўдзялялася Полацку, у першую чаргу яго тапаграфіі, дэмаграфіі і статыстыцы. Горад меў характэрную планіроўку, складаўся з Ніжняй і Верхняй часткі. У «Тапаграфічных заўвагах...» 1780 года ўзгадваліся размешчаныя на пакатым беразе Заходняй Дзвіны Ніжні горад і на раўніне больш значны па памерах – Верхні; у Ніжнім горадзе было 350 драўляных дамоў (з іх 100 належала яўрэям), адзначаны 42 купцы, 395 мяшчан, 478 яўрэяў, сярод заняткаў – актыўны гандаль з Рыгай [5, с. 52].

Рускі генерал-паруччык А.М. Лунін, які з 1784 года займаў пасаду кіраўніка Полацкага намесніцтва (з’ехаў з Полацка ў красавіку 1792 г.), у рабоце «Гістарычнае і гаспадарчае апісанне Полацкага Намесніцтва...» 1792 года адзначаў, што рака Палата аддзяляе ад горада два гарадскіх «фарштата», якія называюцца старае і новае Запалоцце, акружнасць горада – 6 верст і 350 сажняў, у даўжыню па рацэ Дзвіне з фарштатамі 2 вярсты і 126 сажняў, у шырыню 1 вярста і 59 сажняў, ён нагадвае паралелаграм [6, л. 25]. У горадзе мелася 849 дамоў жыхароў, яго насельніцтва складалася з купцоў – 168 хрысціян, 135 яўрэяў, мяшчан – 1130 хрысціян і 1065 яўрэяў, агульную лічбу А.М. Лунін называў у 2195 чалавек [6, л. 27].

Рускі акадэмік В.М. Севяргін, які наведаў Беларусь у 1802 годзе, дзяліў горад на стары, новы і прадмесці. Колькасць дамоў ён называў каля 1000, жыхароў (купцоў, мяшчан, яўрэяў) было больш за 2500 [7, с. 85]. Дадзеныя па насельніцтву горада, магчыма, не ўлічвалі асоб жаночага полу і жыхароў левабярэжжа. А.М. Люты, згодна с рэвізіямі 1786 і 1796 гадоў прыводзіць адпаведныя лічбы ў 5326 і 5622 чалавекі [3, с. 31].

Пасля далучэння да Расіі пачалі будавацца новыя віды грамадскіх пабудоў, уносіліся змены ў планіроўку кварталаў горада, будаваліся тры квадратныя плошчы, у першую чаргу галоўная, з адміністрацыйнымі будынкамі (рэгулярны план перабудовы правабярэжжа 1778 г.). Лепшымі будынкамі горада А.М. Лунін называў размешчаныя на квадратнай, брукаванай «дзікім» каменем плошчы прысутныя месцы, квадратны гасціны двор з 35 крамамі, каменныя жылыя дамы для гарадскога кіраўніцтва, два каменных «магазіны» – правіянтны і саляны – на беразе Дзвіны, там жа былі размешчаныя мытныя будынкі [6, л. 25]. Некаторыя вуліцы былі брукаваныя, а некаторыя вымашчаны расколатымі бярвеннямі (г. зн. «дылямі»), плошча для гандлю вяскоўцаў была немашчоная [6, л. 26].

Па сведчанню А.М. Луніна, горад населены «людзьмі беларускімі» праваслаўнай, уніяцкай, каталіцкай, евангелісцкай канфесій, а таксама яўрэямі. Амаль усе жылыя дамы гараджан былі драўлянымі, што ўвогуле ўласціва для беларускага горада канца XVIII стагоддзя, дзе каменныя дамы складалі каля 2 % забудовы [3, с. 21]. Па дадзеным 1780 года ў Полацку было 360 драўляных дамоў і ніводнага каменнага [1, с. 504]; А.М. Лунін называў 11 каменных і 838 драўляных дамоў жыхароў горада [6, л. 27].

Вопратка беларускага насельніцтва характарызавалася як ахайная, «па-польскаму звычаю доўгая», у побыце гараджане былі далікатныя, трымаліся звычаяў продкаў, у іх хатах была «чысціня пасрэдная», яўрэі характарызаваліся А.М. Луніным як спрытныя і прадпрымальныя ў гандлёвых справах людзі, якія часта мянялі прадмет гандлю, яны насілі доўгае чорная адзенне, суконную, з даўгімі шырокімі да зямлі рукавамі вопратку [6, л. 27]. Асноўныя спажывецкія тавары гараджане атрымлівалі з Рыгі і сельскай мясцовасці, садоў пры дамах не трымалі, але вырошчвалі гародніну – капусту, буракі, гарох, боб, моркву, агуркі, рэпу, мак, часнок, цыбулю, хрэн, пятрушку, салат, сельдэрэй, пастарнак [6, л. 28].

Галоўным заняткам гараджан быў гандаль, разам з тым сярод асноўных «мастацкіх» прафесій А.М. Лунін узгадваў маляроў, сярэбранікаў, краўцоў, шаўцоў, ганчароў, гарбароў і муляраў, адзначаючы іх параўнальна невялікую колькасць і «пасрэднае мастацтва». У 1697 годзе горад атрымаў дазвол на дзве ярмаркі на Хрышчэнне і Пятроў дзень, разам з тым, як сведчыў А.М. Лунін, у яго час гэтага няма, а адбываюцца звычайныя «з'езды сялян»; гараджане гандлявалі крамным таварам, вінаградными вінамі, прадуктамі ляснога і сыпнога промыслаў [6, л. 28]. Гандаль віном і вострымі прыправамі ў якасці асноўных заняткаў гараджан адзначаў В.М. Севяргін [7, с. 85]. Крамныя тавары атрымлівалі з Кенігсберга, Рыгі, Масквы, ярмарак Полацкага і Магілеўскага намесніцтваў. Напоі прывозілі з Рыгі на 8 000 руб. і прадавалі ў Полацку і іншых гарадах. «Сыпны» тавар атрымлівалі ад памешчыкаў Полацкага намесніцтва, а большай часткай – з Польшчы, усяго на 25 000 руб., вязлі яго ў Рыгу, дзе набывалі замежную соль на 5000 руб., якую прадавалі на Полаччыне, а большай часткай – у Польшчы. Таксама значнае месца займаў гандаль лесам, які везлі з «Вялікарасіі», Смаленскага, Пскоўскага намесніцтваў прыкладна на 5000 руб. і зганялі плытамі ў Рыгу [6, л. 28, 29].

Адным з найбольш населеных, разам з Віцебскім уездам намесніцтва, быў Полацкі. Ён меў у шырыню 114, дліну – 76 вёрст, у ім пражывала 27 106 мужчын і 26 690 жанчын, больш за ўсё было адданых у арэнду сялян старостваў – 2258, езуіцкіх – 5046, «духоўных» – 2149 (інфармацыя толькі па мужчынскаму полу) [6, л. 30, 33]. В.М. Севяргін для ўсёй «полацкай акругі» называў лічбу ў 48 869 чалавек [7, с. 85]. Колькасць жыхароў Полацкага ўезда (1257 вёсак) у «Тапаграфічных заўвагах…» 1780 года вызначалася ў 26 490 чалавек (з іх яўрэяў – 841) [5, с. 53]. Такая ж лічба насельніцтва называлася ў вопісе Полацкага намесніцтва 1780 года (толькі вёсак было 1247) [2, с. 254]. Згодна з А.М. Луніным, ва ўездзе было 1 мястэчка, 3 слабады, 1304 сёл і вёсак, 180 памешчыцкіх дамоў, 2 уніяцкіх манастыры – у мястэчку Сіроціна (драўляны, 4 манахі) і ў сяле Махараве (драўляны, 7 манахаў) [6, л. 32].

Матэрыяльную аснову прамысловасці ўезда складалі 36 мучных млыноў, 3 малых заводы, якія выраблялі паташ, 2 железных горна ў памешчыкаў (жалеза ішло на сошнікі сялянам), невялікія конскія заводы, некалькі цагляных памешчыцкіх заводаў, прадукцыя якіх ішла ў асноўным на ўласныя патрэбы; з каменя з берагоў Дзвіны ў пячах рабілі вапну, з гліны рабілі гаршчкі і іншы вясковы посуд [6, л. 31].

Сяляне жылі ў адносна невялікіх, пабудаваных без планавай сістэмы вёсках, што складае характэрную асаблівасць традыцыйнага жылля паўночна-ўсходняга рэгіёну Беларусі [8, с. 46]. Для паўночных і паўночна-ўсходніх рэгіёнаў Беларусі была ўласцівая замкнёная планіроўка сядзібы, асноўнымі кампанентамі яе былі хата, да якой з боку прымыкалі хлявы, і клець з іншымі пабудовамі насупраць [9, с. 88]. Забудова сялян Полацкага ўезда ўтрымлівала асноўныя элементы гэтага тыпу сядзібы – побач з трохкамернай курной хатай размяшчаліся невялікія хлявы, клець стаяла насупраць; каля дома быў агарод, за ім – гумно [6, л. 33]. Разам з тым у апісанні не ўзгадываюцца іншыя гаспадарчыя пабудовы, у тым ліку тыповая для дадзенага рэгіёну лазня, таксама паркан, які звычайна замыкаў двор.

Земляробства ў краі патрабавала значных намаганняў, добрым ураджаям не спрыялі характэрныя для Полаччыны глебы. С. Пляшчэеў адзначаў, што глеба ў намесніцтве большай часткай гліністая, пясчаная, ілаватая і што родзяцца на ёй асабліва добра канапля і лён; таксама адзначалася вялікая колькасць ліпавага лесу [4, с. 74]. Глебы каля Дзвіны былі пясчана-ілістыя, гліністыя, пясчаныя, у задзвінскай частцы пераважна рос лес, які прызначаўся на дровы, бары сустракаліся значна радзей [5, с. 66]. Асноўнай сістэмай земляробства было трохполле (хаця ўзгадваліся і ляды), аралі на конях (гэта складала этнаграфічную спецыфіку рэгіёну), актыўна выкарыстоўвалі гной. Сеялі жыта, пшаніцу, ячмень, авёс, гарох, боб, грэчку, чачавіцу (не ўсюль), ураджай у значнай ступені залежыў ад колькасці ўгнаенняў. Звяртае ўвагу адсутнасць сярод палявых сельскагаспадарчых культур бульбы.

Прылады сельскагаспадарчай працы, як адзначаў В.М. Севяргін, – сохі, для баранавання ўжываліся старажытныя, зробленыя з сасновых і яловых суччаў смыкі; снапы сушылі на азяродах, у «авінах» (ёўнях, асецях) [7, с. 94]. А.М. Лунін апісваў іх як хаты з печчу і жэрдкамі над ёй, у памешчыкаў былі і асеці з печчу ў зямлі – у сярэдзіне, з кажухом для бяспекі, а таксама абнесеныя зрубам з насцілам, дзе дым праходзіў праз адтуліны ў ніжняй частцы збудавання і ў страсе [6, л. 34].

Адзначым, што ў XVIII стагоддзі ў паўночна-ўсходнім рэгіёне беларускіх земляў існаваў характэрны шляхецкі гуменны комплекс: агароджаны парканам, з варотамі, у цэнтры якога было гумно (ці «такоўня») з токам і сушылкай з печкай (ёўняй, асеццю), асобна размешчанымі пунямі, адрынамі, спіхлежамі, іншымі будынкамі, крытымі саломай, дранкай; «прэплотамі» (вялікімі азяродамі) для сушкі снапоў. Згодна з вопісам інвентару фальварка Бернаў Полацкага ўезда (1792 г.) гуменны комплекс («гумнішка») складаўся з тока з двума асецямі, варотамі, насупраць гумна размяшчалася пуня, уся забудова была пакрыта дорам, а паверху саломай; там жа размяшчаліся два азяроды з 8 і 5 жэрдак [10, с. 132]. Увогуле, наяўнасць асеці ці ёўні для сушкі снапоў была характэрна для сялянскага двара гэтага рэгіёну па дадзеных другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя, такая ж асаблівасць была ўласцівая і для шляхецкай сядзібы XVIII стагоддзя.

Малацілі сяляне на таку з зямлі і гліны цапамі, веялі лапатамі, малолі большай часткай на ручных жорнах. Хлеба да новага ўраджаю не хапала, і сяляне вясной бралі зерне ў доўг пад працэнты. Вясной ужывалі ў ежу грыбы (іх увогуле спажывалі мала), елі таксама бабоўнік (яго карані) з балот [6, л. 32]. У агародах сеялі капусту, буракі, моркву, агуркі, цыбулю, у шматлікіх мясцовасцях – бульбу; гэтыя культуры выкарыстоўваліся выключна для ўласнага ўжывання [6, л. 35].

Акрамя сельскай гаспадаркі, сяляне займаліся жывёлагадоўляй, промысламі і рамёствамі. Сярод асноўных заняткаў жыхароў намесніцтва С. Пляшчэеў называў гадоўлю рагатай жывёлы, вытворчасць мёду, воску і поташу [4, с. 74]. Істотная месца ў прамысловасці займала льнаводства (высявалася да 1500 чвэрцей) – часаны лён, абмалочанае зерне адпраўлялі ў Рыгу, з «ахлопьяў» рабілі тлусты холст для сялян [6, л. 35]. Таксама вырошчвалі каноплю (не болей за 500 чвэрцей) – з яе атрымлівалі алей. Адсутнасць вялікіх лясоў стрымлівала развіццё пчалярства, але яно было распаўсюджана – вуллі з выдзеўбаных калод (борці) размяшчаліся пераважна на агародах. Таксама заняткам сялян, што жылі ў лясістых мясцінах, быў выраб калёсаў, саней, бочак, кадак, вёдзер на продаж у горад, у адносна бязлесых сяляне актыўна займаліся гандлем на рынках, каб набыць дроў; пасля далучэння да Расіі распаўсюдзілася адыходніцтва [6, л. 36].

**Заключэнне.** Розныя гістарычныя крыніцы па гісторыі матэрыяльнай культуры Полацка і вясковага насельніцтва Полаччыны канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя дазваляюць вызначыць характэрныя рысы, а таксама змены матэрыяльнай культуры гэтага рэгіёну. Гэта пераважна гандлёвы накірунак дзейнасці гараджан, з’яўленне новых тыпаў грамадскіх каменных гарадскіх пабудоў пры захаванні традыцыйнага драўлянага жылля. Характэрныя гаспадарчыя заняткі вяскоўцаў Полаччыны, акрамя земляробства і жывёлагадоўлі, – льнаводства, бортніцтва, дрэваапрацоўчыя рамёствы.

Асаблівасці матэрыяльнай культуры, характэрныя для дадзенага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёну ў больш позні гістарычны перыяд, – наяўнасць адносна невялікіх вёсак, сядзіб блізкай да вяночнага тыпу планіроўкі, асецей, – фіксуюцца крыніцамі канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя.

ЛІТАРАТУРА

1. Россия. Полное Географическое описание нашего отечества. Настольная и дорожная книга для русских людей / под ред. В.П. Семенова. – СПб.: Издание А.Ф. Девриена, 1905. – Т. 9: Верхнее Поднепровье и Белоруссия / сост.: В.П. Семенов [и др.]. – 620 с.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: БелЭн, 2002. – 912 с.
3. Лютый, А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века / А.М. Лютый.– Минск: Наука и техника, 1987. – 181 с.

4. Плещеев, С. Обозрение Российской Империи в нынешнем ея новоустроенном состоянии, учиненное Сергеем Плещеевым / С. Плещеев. – СПб.: Печатано в типографии у Шнора, 1787. – 190 с.
5. Топографические примечания на знатнейшие места путешествия Ея Императорскаго величества в Белорусския наместничества. – СПб., 1780. – 133 с.
6. Лунин, А.М. Гисторическое и хозяйственное Описание Полоцкаго Наместничества вообще и частно городов и уездов онаго с приложением Генеральныя геометрическия карты всего Наместничества и прочих уездных карт особо с городскими планами и гербами, собранное и в порядок приведенное трудами Его Превосходительства, Г. Генерала порутчика, бывшаго правителя сего Наместничества, члена Экономическаго Общества и Кавалера Александра Михайловича Лунина, сообщенное от него в дар Вольному Экономическому Обществу 18 декабря 1792 года. – Российская национальная библиотека (г. Санкт-Петербург). – Фонд отдела рукописей. – Библиотека Вольного экономического общества. – Оп. 405. – Ед. 42.
7. Севергин, В. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российскаго государства: Или менералогическия, технологическия и другия примечания, учиненныя во время проезда через оныя в 1803 году Васильем Севергиным / В. Севергин. – СПб.: При Императорской Академии наук, 1804. – 168 с.
8. Углик, И.Г. Белорусская крестьянская усадьба XVII – XVIII вв. как хозяйственно-архитектурный комплекс / И.Г. Углик // Вести Института савременных знаний. – 2007. – № 3. – С. 45 – 49.
9. Цітоў, В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.
10. Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов: в 39 т. – Вильна: В типографии А.Г. Сыркина, 1865 – 1915. – Т. 38: Инвентари староств, имений, фольварков и деревень XVIII в. – 1914. – IX + 504 с.


*Паступіў 02.03.2010*

## MATERIAL CULTURE OF POLOTS REGION IN THE SOURCES OF THE END OF 18TH – BEGINNING OF THE 19TH CENTURY (NEW MATERIALS AND RESEARCH ASPECTS)

***I. VUGLIK***

*On the basis of works of A.M. Lunin, V.M. Severgin and others material culture of Polotsk region of the end of 18th – beginning of the 19th century is considered, demographical and statistical data on the population of Polotsk and Polotsk region is given as well. Activities, trades and crafts, dwellings and agricultural equipment of the population are under research. Characteristic features of material culture of the population: timber dwellings, mostly trade activities, as well as changes in the city architecture related to the building of the new community enterprises are determined. Specific for this historical ethnographical region for the next historical period components of dwellings, agricultural equipment, activities of rural population are distinguished: comparatively small rural settlements, close to enclosed type of homesteads, presence of grain driers among farmer, developed flax production, etc.*